Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________ С.Л. Шпарло
“07” 07 2023 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6-13-1/эвуч.

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці 6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць, зацверджанага Першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 18.01.2023 № 6-05-03-007/пр., вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Н.Ю. Вайцэховіч, загадчык кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
А.Ю. Казленка, дацэнт кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Л.А. Аўгуль, загадчык навукова-даследчага аддзела дзяржаўнай установы "Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі";
В.А. Касап, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 26.06.2023);
Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 05.07.2023)

**УЗГОДНЕНА**

Загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства
дзяржаўнай установы "Цэнтральная навуковая
бібліятэка імя Якуба Коласа
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі",
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

____________________ Ю.А. Пераверзева

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль “Інфармацыйная культура” складаецца з двух вучэбных дысцыплін “Уводзіны ў спецыяльнасць” і “Інфармацыйная культура спецыяліста”. Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Уводзіны ў спецыяльнасць”.

Вучэбная дысцыпліна “Уводзіны ў спецыяльнасць” з’яўляецца базавай для фарміравання ў студэнтаў пачатковых прафесійных ведаў і ўяўленняў, якія дапамогуць ім на працягу ўсяго перыяду навучання арыентавацца ў прафесійнай сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, інфармацыі і дакументацыі. Прыярытэтным накірункам зместу навучання з’яўляецца фарміраванне культуры адносінаў да выбранай спецыяльнасці, базавых тэхнік прафесійнага мыслення і кантэксту для далейшага развіцця сістэмы бібліятэчна-інфармацыйных ведаў і актуальных навыкаў, неабходных для эфектыўнай дзейнасці ў зменлівым інфармацыйным асяроддзі.

Значная ўвага надаецца навучанню базавым прынцыпам арганізацыі вучэбнай, навукова-даследчай, самастойнай работы студэнтаў, фарміраванню культуры інтэлектуальнай дзейнасці і работы з інфармацыяй, навыкаў самаменеджменту. Студэнты пазнаёмяцца з сучаснымі формамі і інструментамі прафесійных камунікацый бібліятэкараў, асноўнымі інфармацыйнымі рэсурсамі і крыніцамі прафесійных ведаў.

Мэтай вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Уводзіны ў спецыяльнасць” з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў базавых прафесійных арыентацый у сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, комплекснага ўяўлення аб прафесіі, актуальным стане сістэмы інфармацыйна-дакументных камунікацый і бібліятэк як інфармацыйных і сацыяльна-культурных цэнтраў, авалоданне асновамі арганізацыі інтэлектуальнай дзейнасці, адукацыі і самадукацыі.

Дасягненне гэтай мэты рэалізуецца праз вырашэнне наступных задач:

– азнаямленне студэнтаў са зместам, спецыфікай і сучасным станам бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці: асноўнымі практыкамі, тэхналогіямі, арганізацыйнай структурай, накірункамі дзейнасці, задачамі бібліятэк і бібліятэчных спецыялістаў у сучасным грамадстве;

– засваенне асноўных прынцыпаў эфектыўнай арганізацыі вучэбнай, навукова-даследчай дзейнасці, самаменеджменту і самаадукацыі, тэхналогій работы з прафесійнай інфармацыяй;

– фарміраванне каштоўнасных адносін да будучай прафесіі, развіццё інтэлектуальных, камунікатыўных і творчых здольнасцяў у кантэксце асэнсавання дзейнасці бібліятэк, інфармацыйных працэсаў і з’яў.

Кампетэнцыі, атрыманыя пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны “Уводзіны ў спецыяльнасць”, з’яўляюцца асновай для засваення агульнаадукацыйных дысцыплін, дысцыплін спецыяльнасці і напрамкаў. Вучэбная дысцыпліна змястоўна звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як “Тэорыя інфармацыі і камунікацыі”, “Інфармацыйная культура спецыяліста”, “Бібліятэказнаўства. Тэорыя”.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны "Уводзіны ў спецыяльнасць" павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

УК-5 – Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці;

УК-6 – Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да зменаў у прафесійнай дзейнасці;

СК-2 – Разумець мэты і задачы сваёй будучай прафесіі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

*ведаць:*

– сутнасць, змест, асноўныя накірункі і віды бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, сучасныя патрабаванні да яе;

– актуальную структуру і асаблівасці развіцця сістэмы інфармацыйна-дакументных камунікацый як сферы прафесійнай дзейнасці;

– асновы работы з інфармацыяй і прафесійныя рэсурсы бібліятэкара;

*умець:*

– карэктна вызначаць задачы бібліятэк як інфармацыйных і сацыяльна-культурных цэнтраў у залежнасці ад тыпу бібліятэк і аўдыторый, спецыфікі рэгіёну, гарадскіх культурных прастор;

– даваць агульную характарыстыку дыяпазону рэсурсаў і паслуг бібліятэкі, сацыякультурных праектаў і тэхналагічных інавацый у дзейнасці бібліятэк, спосабаў арганізацыі бібліятэчнай прасторы;

*валодаць:*

– спосабамі засваення вучэбнага матэрыялу, арганізацыі інтэлектуальнай дзейнасці, адукацыі і самаразвіцця ў прафесійнай сферы;

– тэхналогіямі апрацоўкі і сістэматызацыі прафесійнай інфармацыі;

– навыкамі творчага падыходу да бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Уводзіны ў спецыяльнасць" прадугледжана ўсяго 90 гадзін, з іх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладанае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцый – 24 гадзіны, семінарскія – 4 гадзін, практычныя – 6 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны*

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны “Уводзіны ў спецыяльнасць”. Яе месца ў сістэме падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў. Кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў студэнаў падчас вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Тэарэтыка-практычная накіраванасць вучэбнай дысцыпліны, яе ўзаемасувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай працы студэнтаў. Формы кантролю. Характарыстыка забяспечанасці вучэбнай дысцыпліны вучэбнай, метадычнай і навуковай літаратурай.

### Раздзел I. Прафесія бібліятэкара-бібліёграфа: сфера дзейнасці і сучасныя патрабаванні

*Тэма 1. Бібліятэчная прафесія ў сучасным свеце*

Сутнасць прафесіі бібліятэкара і яе сацыяльная значнасць. Асноўныя задачы бібліятэк як інфармацыйных і сацыяльна-культурных цэнтраў. Актуальныя трэнды развіцця бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Перспектывы развіцця бібліятэк у лічбавую эпоху: камунікатыўная канцэпцыя Дэвіда Лэнкеса, канцэпцыя медыйных і лічбавых гуманітарных навук Вольфганга Эрнста, канцэпцыя лічбавізацыі Рагнара Аўдунсона. Ідэі нефармальных вучэбных і рабочых прастор, “трэцяга месца”, інтэлектуальна-творчага хаба і інш. Агульныя звесткі аб спецыфіцы бібліятэк розных тыпаў.

Змест, накірункі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і сучасныя патрабаванні да яе. Т-метафора прафесійных кампетэнцый для развіцця талентаў і лідараў у лічбавую эпоху. Бібліятэкар як спецыяліст сучаснай творчай прафесіі: soft skills, мультыдысцыплінарныя кампетэнцыі (сацыяльна-культурнае праектаванне, лічбавыя навыкі і работа з данымі, сацыяльныя камунікацыі), ядро прафесійных ведаў. Асаблівасці прафесійнага мыслення бібліятэкара, віды інтэлектуальных і творчых задач. Этычныя нормы бібліятэчнай прафесіі. Кодэкс прафесійнай этыкі бібліятэкараў Беларусі.

Прафесія бібліятэкара ў літаратуры і мастацтве. Арт-рэпрэзентацыя сучасных бібліятэчных практык.

*Тэма 2. Мадэль спецыяліста інфармацыйна-дакументнай сферы*

Мадэль спецыяліста як паняцце. Кампетэнцыя і кампетэнтнасць спецыяліста. Паняцце «кваліфікацыя спецыяліста».

Профіль адукацыі і накірункі падрыхтоўкі па спецыяльнасці «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць». Сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і іх характарыстыка. Асноўныя задачы, якія вырашае бібліятэчны спецыяліст у прафесійнай дзейнасці. Віды бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці: вытворча-практычная, сацыяльна-культурная, інавацыйна-метадычная, навукова-даследчая, арганізацыйна-кіраўнічая. Прафесійна-значныя якасці для

бібліятэкара-бібліёграфа: праектавыя, арганізатарскія, камунікатыўныя, гнасеалагічныя, маральныя.

Прафесійная кваліфікацыя «бібліятэкар-бібліёграф» (вышэйшая адукацыя, першая ступень): акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя, прафесійныя кампетэнцыі.

Прафесійная гатоўнасць бібліятэчнага спецыяліста і яе асноўныя параметры.

*Тэма 3. Бібліятэчна-інфармацыйная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь*

Адукацыйныя цэнтры ў сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Падрыхтоўка бібліятэчных кадраў у Магілёўскім дзяржаўным каледжы мастацтваў. Роля прафесійных бібліятэчных асацыяцый у падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі бібліятэчных супрацоўнікаў. Дзейнасць Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі ў сферы прафесійнай адукацыі. Найбуйнейшыя бібліятэкі краіны як цэнтры прафесійнай камунікацыі і адукацыі.

Кароткая гісторыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Арганізацыйная структура ўніверсітэта. Спецыфіка работы адміністрацыі ўніверсітэта розных узроўняў. Самакіраванне ва ўніверсітэце. Выхаваўчая работа ва ўніверсітэце. Студэнцкі прафсаюз універсітэта. Бібліятэка ўніверсітэта, яе рэсурсы, паслугі і функцыі. Адпачынак і спорт ва ўніверсітэце.

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў: гісторыя і сучаснасць. Дэканат факультэта. Кафедры факультэта. Прафесарска-выкладчыцкі склад факультэта. Выдатныя спецыялісты, якія працавалі на факультэце.

Правы і абавязкі студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

*Тэма 4. Інфармацыйна-дакументныя камунікацыі як сфера прафесійнай дзейнасці бібліятэкара*

Сістэма інфармацыйна-дакументнай камунікацыі, яе складнікі. Паняцце інфармацыйнай дзейнасці. Дакумент як носьбіт інфармацыі. Інфармацыйныя рэсурсы, сутнасць і агульная характарыстыка. Інфармацыйныя рэсурсы ў інфасістэме. Інфармацыйныя рэсурсы грамадства. Сутнасць і значэнне інфармацыйна-дакументнай камунікацыі.

Паняцце інфармацыйнага цэнтру. Інфармацыйныя цэнтры сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый: бібліятэкі, архівы, выдавецтвы, СМІ, інфармацыйныя і інфармацыйна-аналітычныя цэнтры і аддзелы арганізацый і прадпрыемстваў, патэнтныя арганізацыі і аддзелы, кнігагандлёвыя ўстановы, службы тэлекамунікацыі і перадачы даных, кансалтынгавыя фірмы, банкі, біржы і г. д.

Бібліятэка як інфармацыйны цэнтр: задачы, функцыі і асноўныя працэсы. Паняцце інфармацыйных паслуг. Рынак інфармацыйных прадуктаў і паслуг, яго сегментацыя. Сучасныя сегменты рынка інфармацыйных прадуктаў і паслуг, месца бібліятэк і спецыфіка іх дзейнасці.

*Тэма 5. Адкрытыя даныя як сучасны этап развіцця інфасферы. Задачы бібліятэк у сферы адкрытых даных*

Асноўныя характарыстыкі сучаснага інфармацыйнага асяроддзя: лічбавізацыя, адкрытасць, медыйнасць, пашырэнне магчымасцяў узаемадзення карыстальнікаў на аснове мультымадальных сродкаў, інтэлектуалізацыя інфармацыйных сэрвісаў і сістэм цыркуляцыі ведаў.

Даныя як інфраструктура грамадства. Вытокі і сутнасць ідэі адкрытых даных. Адкрытыя даныя як наступны этап развіцця інтэрнэта (Цім Бэрнерс-Лі, стваральнік WWW). Падыходы да вызначэння адкрытых данных, іх галоўныя прыкметы. Пастаўшчыкі і карыстальнікі адкрытых даных. Паняцце метаданых, іх значэнне. Фарматы адкрытых даных.

Парталы і агрэгатары адкрытых даных і іх характарыстыка. Парталы адкрытых даных гарадоў, краін, кантынентаў, міжнародных арганізацый, даследчых цнэтраў, дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый. Партал адкрытых даных Беларусі. Платформы распаўсюджання адкрытых даных. Сістэмы кіравання данымі з адкрытым зыходным кодам. Сусветныя адкрытыя рэпозіторыі навуковых даных. Універсітэцкія рэпазіторыі адкрытых даных, іх задачы і функцыянал.

Бібліятэкі ў сістэме адкрытага доступу і рэфармавання навуковых камунікацый. Спосабы арганізацыі адкрытага доступу. Мэты і задачы навуковых бібліятэк у сферы адкрытых даных. Стварэнне і развіццё рэпазіторыяў адкрытых даных. Пошук адкрытых даных. Міжнародныя і нацыянальныя ініцыятывы у сферы адкрытых даных. Прынцыпы FAIR і роля бібліятэк у іх імплементацыі.

*Тэма 6. Агульны канцэпт і дызайн сучасных бібліятэк*

Бібліятэка як інфармацыйны, грамадскі, адукацыйны і культурны цэнтр. Сучасныя мадэлі дзейнасці бібліятэк. Дыяпазон рэсурсаў і паслуг публічных і навуковых бібліятэк. Канцэптуальная своеасаблівасць бібліятэк.

Агульны канцэпт і дызайн будынкаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Бібліятэкі ў Сан-Сіста (Італія), сучаснай Александрыйскай бібліятэкі (Егіпет), Бібліятэкі імя Т. Гейзеля ў Каліфарнійскім універсітэце ў Сан-Дыега (ЗША), Каралеўскай бібліятэкі Даніі, бібліятэкі-парку Санта-Дамінга (Калумбія), Бібліятэкі Дэлфтскага тэхнічнага ўніверсітэта (Нідэрланды), Публічнай бібліятэкі г. Канзас-Сіці (ЗША), Бібліятэкі Брандэнбургскага тэхнічнага ўніверсітэта (Германія), Цэнтральнай бібліятэкі Сіэтла (ЗША), Публічнай бібліятэкі Бішан (Сінгапур), Цэнтральнай бібліятэкі Хельсінкі «Оодзі» (Фінляндзія) і інш. Місія, задачы і функцыянал буйнейшых бібліятэк свету. Бібліятэкі Беларусі ў кантэксце актуальных трэндаў інфармацыйнай і сацыяльна-культурнай дзейнасці.

*Тэма 7. Арганізацыя ўнутранай прасторы бібліятэкі. Інтэр'ер і тэхнічныя рашэнні*

Сэрвісны ўзровень бібліятэк і забеспячэнне камфорту карыстальнікаў. Піраміда каштоўнасцяў сучасных публічных бібліятэк. Арганізацыя

бібліятэчнай прасторы ў адпаведнасці з асноўнымі задачамі і функцыямі бібліятэк. Падыходы да заніравання прасторы. Арыгінальныя рашэнні ў сферы арганізацыі прасторы і сэрвіса. Трэнды ў афармленні бібліятэчных інтэр'ераў.

Імідж бібліятэкі як гарадской культурнай прасторы. Спосабы арганізацыі зон чытання, нефармальных рабочых прастор, культурна-дасугавых і творчых зон: студыі гуказапісу, каворкінгі, медыялабараторыі, творчыя майстэрні, краязнаўчыя і турыстычныя цэнтры, літаратурныя тэатры і інш. Прыклады інтэр'ерных і дызайнерскіх рашэнняў у арганізацыі бібліятэчнай прасторы беларускіх і замежных бібліятэк.

Тэхналагічныя магчымасці сучасных навуковых і публічных бібліятэк. Выкарыстанне рабатызаванай сістэмы дастаўкі кніг, лічбавых тэхналогій абслугоўвання карыстальнікаў, сучаснага тэхналагічнага абсталявання для арганізацыі выстаў, лабараторый адукацыі і візуалізацыі, медыястудый, музыкальных і гульнёвых зон. Прыклады тэхнічных інавацый у дзейнасці вядучых бібліятэк Беларусі і свету.

## Раздзел II. Арганізацыя працэсу навучання і інтэлектуальная культура студэнта

### *Тэма 8. Формы арганізацыі навучальнага працэсу ва ўстанове вышэйшай адукацыі. Самастойная работа студэнтаў*

Вучэбныя планы як аснова арганізацыі вучэбнага працэса. Расклад вучэбных заняткаў. Нормы нагрузкі студэнта.

Формы арганізацыі вучэбнага працэса ва ўстанове вышэйшай адукацыі: тэарэтычныя, практычныя, камбінаваныя і кантрольныя заняткі. Аўдыторная і пазааўдыторная работа. Лекцыя як тэарэтычная форма навучання. Культура ўспрымання лекцый. Правілы арганізацыі работы на лекцыі. Практычныя і лабараторныя заняткі, іх мэты і задачы. Віды семінарскіх заняткаў. Падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў. Кансультацыя як форма аказання дапамогі студэнтам у іх самастойнай рабоце. Факультатывы і курсы па выбару. Вытворчая і вучэбная практыка.

Бягучая і выніковая атэстацыя студэнтаў. Крытэрыі ацэнкі ведаў. Формы педагагічнага кантролю. Падрыхтоўка да экзамену. Тэсціраванне як форма кантролю ведаў студэнтаў.

Самастойная работа студэнта як форма вучэбнага працэсу. Асноўныя накірункі і віды самастойнай работы студэнтаў. Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Умовы і крытэрыі паспяховага выканання самастойнай работы. Сістэма заданняў для самастойнай работы. Матывацыя і кантроль самастойнай работы.

Модульна-рэйтынгавая і рэйтынгавая сістэмы як адлюстраванне якасці самастойнай работы студэнтаў і кантролю ведаў. Балы і выніковыя адзнакі ў модульна-рэйтынгавай сістэме. Умовы модульна-рэйтынгавай сістэмы. Роля вучэбна-метадычных комплексаў у арганізацыі самастойнай работы студэнтаў. Тэхналогія самаадукацыі. Матывацыя самаадукацыі.

*Тэма 9. Навукова-даследчая дзейнасць студэнта*

Навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў у Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце культуры і мастацтваў. Задачы навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў. Узроўні падрыхтаванасці студэнтаў да навукова-даследчай дзейнасці.

Навуковыя школы факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый. Сучасныя накірункі даследаванняў інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці.

Патрабаванні да навуковай дзейнасці студэнтаў. Сістэма Антыплагіят, прынцыпы работы. Віды і прыклады плагіяту. Ускоснае і прамое цытаванне, правільнасць афармлення цытат. Агульныя правілы падрыхтоўкі і публікацыі студэнцкага навуковага тэксту.

Формы навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў: выкананне студэнтамі практычных заданняў, курсавых і дыпломных прац; студэнцкія навуковыя кружкі; удзел у студэнцкіх навуковых канферэнцыях, алімпіядах, рэспубліканскіх конкурсах. Рэспубліканскія і міжнародныя навуковыя канференцыі ў галіне бібліятэчнай справы. Магчымасці удзелу студэнтаў у навуковых канферэнцыях і форумах замежных краін. Сістэма матывацыі студэнтаў да навукова-даследчай дзейнасці.

*Тэма 10. Арганізацыя інтэлектуальнай дзейнасці студэнта*

Асаблівасці інтэлектуальнай дзейнасці. Разумовая працаздольнасць і яе дынаміка. Біярытмы чалавека. Умовы эфектыўнасці інтэлектуальнай дзейнасці. Разумоваяператамленне і яго прычыны. Эфектыўныя прыёмы адпачынку ад інтэлектуальнай дзейнасці. Гігіена інтэлектуальнай дзейнасці. Ежа для мозга. Агульныя умовы высокай прадуктыўнасці разумовай дзейнасці.

Самаразвіццё адчуванняў. Развіццё ўспрымання. Развіццё ўяўленняў. Сродкі кіравання адчувальнасцю. Канцэнтрацыя ўвагі. Памяць, яе віды і прынцыпы функцыяніравання. Кароткачасовая і доўгачасовая памяць. Развіццё памяці. Творчае ўяўленне і яго роля ў засваенні інфармацыі. Спосабы развіцця творчага ўяўлення.

Навуковая арганізацыя працы. Арганізацыя працоўнага месца. Рацыяналізацыя прыёмаў і метадаў працы. Арганізацыя ўвагі і засваення інфармацыі. Прыёмы паспяховага запамінання і разумення матэрыялу.

Самаменеджмент студэнта. Пастаноўка асабістых мэт. Планаванне асабістых задач. Неабходнасць прыняцця рашэнняў. Прынцыпы планавання часу.

*Тэма 11. Работа з інфармацыяй у вучэбнай*
*і навукова-даследчай дзейнасці студэнта*

Чытанне як складаная інтэлектуальная дзейнасць. Асноўныя мэты, віды і спосабы чытання. Прыёмы і тэхнікі эфектыўнага чытання навуковых часопісаў, артыкулаў у Інтэрнэце, вучэбнай літаратуры. Паглыбленае і хуткаснае чытанне. Тыповыя памылкі ў чытанні.

Бібліятэкі Рэспублікі Беларусь як база для атрымання інфармацыі. Бібліятэка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Віды каталогаў бібліятэк і асаблівасці пошуку ў іх. Электронныя каталогі і базы даных бібліятэк Рэспублікі Беларусь і замежных краін. Асаблівасці пошуку інфармацыі ў Інтэрнэт.

Тэхналогія работы з інфармацыяй. Мэты работы з інфармацыяй. Работа з кнігай, часопісамі, газетамі, слоўнікамі, энцыклапедыямі, электроннымі дакументамі. Віды канспектаў, планаў, тэзісаў, рэфератаў. Анатацыі. Ключавыя словы. Прадметныя рубрыкі. Прыёмы скарачэння тэксту пры запісе. Структура і афармленне пісьмовай працы.

Работа з дакументамі справаводства. Работа з карэспандэнцыяй. Зносіны па тэлефоне і электроннай пошце. Культура публічнага выступлення.

*Тэма 12. Прафесійная камунікацыя будучага спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы*

Мэты і задачы прафесійнай камунікацыі бібліятэкараў. Прафесійныя аб'яднанні ў сферы бібліятэчнай дзейнасці, інфармацыі і дакументацыі. Знакамітыя спецыялісты Беларусі і замежных краін, якія даследуюць пытанні бібліятэчнай справы.

Прафесійныя перыядычныя выданні па бібліятэчнай справе. Ключавыя адкрытыя сеткавыя рэсурсы ў сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

Выдавецтвы, якія выпускаюць кніжную прадукцыю па бібліятэчнай справе. Інфармацыйныя і бібліяграфічныя выданні па бібліятэчнай справе. Паняцце і віды электронных бібліятэчных сістэм. Біябібліяграфічная інфармацыя як крыніца прафесійнай інфармацыі. Электронныя прафесійныя выданні па бібліятэчнай справе ў глабальнай сетцы. Базы даных бібліятэк Рэспублікі Беларусь па бібліятэчнай справе і бібліяграфіі. Блогі бібліятэкараў і бібліятэчных супольнасцяў. Бібліятэкі і бібліятэкары ў сацыяльных сетках.

Бібліятэкі Беларусі як цэнтры прафесійнай камунікацыі і развіцця бібліятэчнай і кніжнай навукі. Міжнародныя і рэспубліканскія канферэнцыі па праблемах бібліятэчнай справы.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ (ДЗЕННАЯ ФОРМА АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | | |
| Уводзіны | 1 | | | | |
| **Раздзел 1. Прафесія бібліятэкара-бібліёграфа: сфера дзейнасці і сучасныя патрабаванні** | | | | | |
| Тэма 1. Бібліятэчная прафесія ў сучасным свеце | 1 | | 2 | 2 | Дыскусіі, абмеркаванне кіна- і аўдыёматэрыялаў, напісанне эсэ |
| Тэма 2. Мадэль спецыяліста інфармацыйна-дакументнай сферы | 2 | | | | Групавыя абмеркаванні, напісанне рэфератаў |
| Тэма 3. Бібліятэчна-інфармацыйная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь | 2 | | | | Групавыя абмеркаванні, выкананне тэстаў |
| Тэма 4. Інфармацыйна-дакументныя камунікацыі як сфера прафесійнай дзейнасці бібліятэкара | 2 | | | | Праблемныя заданні, абмеркаванні, выкананне тэстаў, аналіз экспертных выступаў |
| Тэма 5. Адкрытыя даныя як сучасны этап развіцця інфасферы. Задачы бібліятэк у сферы адкрытых даных | 2 | | | | Праблемныя заданні, аналіз кейсаў |
| Тэма 6. Агульны канцэпт і дызайн сучасных бібліятэк | 2 | 2 | | | Падрыхтоўка дакладаў, прэзентацый, групавыя абмеркаванні |
| Тэма 7. Арганізацыя ўнутранай прасторы бібліятэкі. Інтэр'ерныя і тэхнічныя рашэнні | | 2 | | 2 | Падрыхтоўка дакладаў, прэзентацый, групавыя абмеркаванні, тэсты |
| **Раздзел II. Арганізацыя працэсу навучання і інтэлектуальная культура студэнта** | | | | | |
| Тэма 8. Формы арганізацыі навучальнага працэсу ва ўстанове вышэйшай адукацыі. Самастойная работа студэнтаў | 2 | | | | Выкананне практычных заданняў па засваенні функцый самаменеджменту, кіраванні мэтамі і часам, распрацоўка плана самаадукацыі |
| Тэма 9. Навукова-даследчая дзейнасць студэнта | 2 | | | | Групавыя абмеркаванні, тэсты |
| Тэма 10. Арганізацыя | 2 | 2 | | 2 | Дзелавыя гульні, |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| інтэлектуальнай дзейнасці студэнта | | | | | абмеркаванні, праблемныя заданні |
| Тэма 11. Работа з інфармацыяй у вучэбнай і навукова-даследчай дзейнасці студэнта | | | | 2 | Аналіз прафесійных перыядычных выданняў, групавыя абмеркаванні |
| Тэма 12. Прафесійная камунікацыя будучага спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы | 2 | | | | Аналіз экспертных выступаў, паводніцкае мадэляванне, аналіз прафесійных сеткавых камунікацый |
| **Усяго** | 20 | 6 | 2 | 6 | |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ (ЗАВОЧНАЯ ФОРМА АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі |
| Уводзіны | 1 | | |
| Тэма 1. Бібліятэчная прафесія ў сучасным свеце. Інфармацыйна-дакументныя камунікацыі як сфера прафесійнай дзейнасці | 3 | | 2 |
| Тэма 2. Агульны канцэпт і дызайн сучасных бібліятэк. Арганізацыя ўнутранай прасторы бібліятэкі | 2 | | |
| Тэма 3. Арганізацыя інтэлектуальнай дзейнасці студэнта. Прафесійная камунікацыя будучага спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы | 2 | | |
| **Усяго** | 8 | | 2 |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТА

### Літаратура

*Асноўная*

1. Голубенко, Н. Б. Введение в библиотечное дело [Электронный ресурс]: учеб. пособие / Н. Б. Голубенко. – 2-е изд., испр. – Москва : Национальный Открытый Университет «ИНТУИТ», 2016. – 171 с. : ил. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=429012.

2. Воронцов, Г. А. Труд студента: ступени успеха на пути к диплому : учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений / Г. А. Воронцов. – 2-е изд., перераб. и доп. – Москва : ИНФРА-М, 2019. – С. 119-206.

*Дадатковая*

1. Библиотекарь: выбор профессии. Мастер-класс профессора Ю. Н. Столярова / [ред.-сост. Ю. Н. Столяров]. – Москва : Либерея-Бибинформ, 2010. – 175 с. – (Библиотекарь и время. XXI век ; вып. 124).

2. Галковская, Ю. Н. Компетенции библиотекаря-библиографа цифровой эпохи / Ю. Н. Галковская // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навук. канф. прафесар.-выкладчыц. складу Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў (Мінск, 22 ліст. 2018 г. і 21 ліст. 2019 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2020. – С. 56-60.

3. Галковская, Ю. Н. Требования организаций-заказчиков кадров к молодым специалистам библиотечно-информационной сферы: (по результатам экспертного опроса) / Ю. Н. Галковская // Научный поиск в сфере современной культуры и искусства : материалы науч. конф. профессор.-преподават. состава Белорус. гос. ун-та культуры и искусств (Минск, 26 нояб. 2020 г.) / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2021. – С. 9-13.

4. Галковская, Ю. Н. Факультет информационно-документных коммуникаций: история возникновения, эволюция и перспективы развития / Ю. Н. Галковская // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2020. – № 3 (37). – С. 183-193.

5. Гендина, Н. И. Библиотеки в эпоху социокультурных трансформаций: современные вызовы и основания доказательного библиотековедения / Н. И. Гендина, Л. Н. Рябцева // Библиотековедение. – 2018. – № 1. – С. 7-15.

6. Долгополова, Е. Е. Библиотечное пространство: к вопросу о границах понятия / Е. Е. Долгополова // Материалы V Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры». Комфортная среда библиотек: новые технологические и материально-технические решения,

Минск, 18–19 окт. 2018 г. / [сост. А. А. Суша ; науч. ред. Р. С. Мотульский]. – Минск, 2018. – С. 123-130.

7. Зыгмантович, С. В. Поддержка профессиональной деятельности библиотекарей производителями и агрегаторами цифрового контента / С. В. Зыгмантович, В. И. Саитова // Культура. Наука. Творчество: XIV Международная научно-практическая конференция «Культура. Наука. Творчество», посвященная 75-летию Великой Победы и 45-летию Белорусского государственного университета культуры и искусств (Минск, 14 мая 2020 г.) : сб. науч. ст. / Белорусский государственный университет культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2020. – [Вып. 14]. – С. 214-219.

8. Козленко, Е. Ю. Личностный потенциал как ценность современной библиотечно-информационной деятельности / Е. Ю. Козленко // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навук. канф. прафесар.-выкладчыц. складу Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў, прысвеч. Году культуры ў Рэсп. Беларусь (Мінск, 24 ліст. 2016 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2018. – С. 192-196.

9. Козленко, Е. Ю. Профессиональная ответственность библиотекаря в условиях инновационной парадигмы / Е. Ю. Козленко // Культура: открытый формат – 2011 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, социокультурная деятельность) : сб. науч. работ / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2011. – С. 274-277.

10. Козленко, Е. Ю. Художественная литература в ракурсе профессиональной самоидентификации библиотекаря / Е. Ю. Козленко // Бібліятэчны свет. – 2016. – № 2. – С. 28-30.

11. Организация учебной деятельности студентов : учеб.-метод. пособие / Т. И. Ахмедова, Е. Э. Грибанская, В. Н. Еремин [и др.] ; ред. М. И. Ивашко, С. В. Никитин, Л. И. Новикова. – Москва : Российская академия правосудия, 2011. – 312 с. – Режим доступа : https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=140471. (ЭБС «Университетская библиотека онлайн»)

12. Редькина, Н. С. Стратегические векторы развития библиотек / Наталья Степановна Редькина // Библиотековедение. – 2021. – Т. 70, № 3. – С. 231-241.

13. Степанов, В. К. Библиотекарь эпохи цифры: что должен уметь и знать? / В. К. Степанов // Современная библиотека. – 2014. – № 10. – С. 22-25.

14. Степанов, В. К. Новое видение библиотеки как социального института в обществе знаний / В. К. Степанов // Научные и технические библиотеки. – 2019. – № 1. – С. 7-15.

15. Сукиасян, Э. Великое счастье – заниматься любимым делом / Эдуард Сукиасян // Библиотека. – 2019. – № 3. – С. 50-53.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы

Самастойная работа студэнтаў накіравана на замацаванне тэарэтычных ведаў і практычных уменняў па дысцыпліне і ўключае наступныя заданні: работа з вучэбна-метадычнай літаратурай; прагляд кіна- і відэаматэрыялаў аб прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа; наведванне бібліятэк; напісанне эсэ; фармірававанне інфармацыйных рэсурсаў аб бібліятэчнай прафесіі.

Комплекс заданняў для самастойнай работы носіць інтэлектуальна-творчы характар і мае на мэце развіццё прафесійнага мыслення і творчага падыходу да аналізу інфармацыйных працэсаў і з'яў. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца разуменню ўзаемасувязі інфармацыі, людзей і тэхналогій як базісу прафесійнага мыслення. Праз аналіз і прэзентацыю канцэптуальных рашэнняў у дызайне бібліятэк і арганізацыі ўнутранай прасторы, характарыстыку рэсурсаў і сэрвісаў, тэхналагічных магчымасцяў, сацыякультурных і арт-праектаў бібліятэк студэнты набываюць здольнасць сінтэзаваць інфармацыйна-тэхналагічныя і гуманітарныя аспекты бібліятэчнай дзейнасці.

Самастойная работа арыентавана на паглыбленне ведаў аб сферы прафесійнай дзейнасці бібліятэкараў, у тым ліку сучасным стане і прагназуемым развіцці інфармацыйнага асяроддзя і інфармацыйных тэхналогій. Прадугледжаны прагляд фільмаў, міні-серыялаў, чытанне літаратурных твораў, у якіх асэнсоўваецца развіццё сучаснага тэхналагічнага грамадства ў яго сацыяльных і культурных вымярэннях.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі дыягностыкі:

– стандартныя заданні па асноўных тэмах (характарыстыка асноўных паняццяў сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый, сучасных напрамкаў развіцця бібліятэк, ключавога набору інфармацыйных рэсурсаў па спецыяльнасці і г. д.);

– прадуктыўныя і творчыя заданні па асобных тэмах і дысцыпліне цалкам (падрыхтоўка візуалізацый і прэзентацыі дзейнасці бібліятэк па выніках site visit, пошук і аналіз даных на парталах адкрытага доступу, характарыстыка сэрвіснага ўзроўню, дызайну, тэханалагічных інавацый, праектаў і мерапрыемстваў бібліятэк у суадносінах з асноўнымі задачамі бібліятэчнай дзейнасці, абмеркаванне кіна- і відэа-матэрыялаў, літаратурных твораў і г. д.);

– развіццёвыя заданні і тэсты на засваенне тэхналогій пошуку, апрацоўкі і сістэматызацыі прафесійнай інфармацыі, развіцця памяці і творчага ўяўлення;

– практычныя заданні па засваенні функцый самаменеджменту, кіраванні мэтамі і часам, распрацоўцы плана самаадукацыі;
– групавыя абмеркаванні найбольш складаных пытанняў курса;
– напісанне эсэ, рэфератаў;
– аналіз лепшых прадстаўнікоў прафесіі, паводніцкае мадэляванне.